**ПАЛАЖЭННЕ аб Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь**

1. Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь (далей - МЗС) з'яўляецца рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання і падпарадкоўваецца Ураду Рэспублікі Беларусь. Па асобных пытаннях дзейнасці, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, МЗС можа падпарадкоўвацца выключна Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

2. МЗС праводзіць дзяржаўную палітыку ў сферы знешніх сувязяў, ажыццяўляе каардынацыю знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь.

3. У сваёй дзейнасці МЗС кіруецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, гэтым Палажэннем і ажыццяўляе яе ва ўзаемадзеянні з рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, іншымі арганізацыямі.

4. У сістэму МЗС ўваходзяць цэнтральны апарат МЗС, дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь (далей - замежныя ўстановы Рэспублікі Беларусь), а таксама дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя МЗС, паводле пераліку, зацверджанаму Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

5. Асноўнымі задачамі МЗС з'яўляюцца:

5.1. рэалізацыя адзінай знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, у тым ліку каардынацыя палітыкі ў галіне знешнеэканамічнай дзейнасці;

5.2. забеспячэнне правоў і інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у міжнародных адносінах;

5.3. прадстаўленне Рэспублікі Беларусь у адносінах з замежнымі дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі і міждзяржаўнымі ўтварэннямі; фарміраванне, падтрыманне і ўмацаванне пазітыўнага іміджу Рэспублікі Беларусь за мяжой;

5.4. каардынацыя дзейнасці рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання па забеспячэнні адзінай палітыкі Рэспублікі Беларусь у адносінах з замежнымі дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі і міждзяржаўнымі ўтварэннямі;

5.5. абарона правоў і інтарэсаў фізічных і юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь за мяжой;

5.6. стварэнне спрыяльных умоў для прасоўвання эканамічных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь за мяжой;

5.7. планаванне знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці;

5.8. збор і аналіз інфармацыі аб фактарах і тэндэнцыях міжнароднага развіцця і ўнясенне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, ва Урад Рэспублікі Беларусь,у Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь прапаноў і рэкамендацый па тактычным рэагаванні і стратэгічных напрамках знешнепалітычнага і знешнеэканамічнага супрацоўніцтва ў інтарэсах Рэспублікі Беларусь;

5.9. забеспячэнне рэалізацыі рашэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па пытаннях знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь;

5.10. каардынацыя дзейнасці дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь па фарміраванні і ўдасканаленні дагаворна- прававой базы адносін Рэспублікі Беларусь з замежнымі дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі і міждзяржаўнымі ўтварэннямі;

5.11. кантроль за выкананнем міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь дзяржаўнымі органамі Рэспублікі Беларусь і аказанне садзейнічання ў выкананні міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь;

5.12. каардынацыя работы па далучэнні Рэспублікі Беларусь да Сусветнай гандлёвай арганізацыі;

5.13. кіраўніцтва працай замежных установаў Рэспублікі Беларусь;

5.14. прадстаўленне інфармацыі па ўмовах ажыццяўлення знешнеэканамічнай дзейнасці дзяржаўным органам, іншым юрыдычным і фізічным асобам Рэспублікі Беларусь і замежным партнёрам;

5.15. забеспячэнне развіцця інфраструктуры знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь і аказанне садзейнічання ў развіцці інфраструктуры знешнеэканамічнай дзейнасці рэспублікі;

5.16. каардынацыя работы па фарміраванні рэжыму знешняга гандлю таварамі ў адносінах з замежнымі дзяржавамі;

5.17. садзейнічанне ў прыцягненні замежных інвестыцый у эканоміку Рэспублікі Беларусь;

5.18. садзейнічанне грамадскім аб'яднанням Рэспублікі Беларусь у ажыццяўленні сувязяў з замежнымі партнёрамі і развіцці супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой.

6. МЗС у адпаведнасці з ускладзенымі на яго задачамі:

6.1. вывучае фактары і тэндэнцыі міжнароднага развіцця, міжнароднае становішча, унутраную і знешнюю палітыку замежных дзяржаў, дзейнасць міжнародных арганізацый і рухаў, аналізуе развіццё адносін Рэспублікі Беларусь з замежнымі дзяржавамі, ступень эфектыўнасці яе ўдзелу ў працы міжнародных арганізацый і ўносіць прапановы Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і ва Урад Рэспублікі Беларусь па вызначэнні прыярытэтаў знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці;

6.2. ажыццяўляе інфармацыйна-прапагандысцкае забеспячэнне знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь;

6.3. каардынуе супрацоўніцтва дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь з адпаведнымі органамі замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў, а таксама ў рамках міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў;

6.4. кіруе дзейнасцю прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь у органах Саюзнай дзяржавы, Еўразійскай эканамічнай супольнасці і Садружнасці Незалежных Дзяржаў;

6.5. вядзе падрыхтоўку і ўдзельнічае ў ажыццяўленні візітаў дзяржаўных і ўрадавых дэлегацый Рэспублікі Беларусь за мяжу, а таксама дзяржаўных і ўрадавых дэлегацый замежных дзяржаў у Рэспубліку Беларусь, каардынуе і кантралюе выкананне дамоўленасцей па выніках гэтых візітаў;

6.6. праводзіць перамовы з прадстаўнікамі замежных дзяржаў, міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў;

6.7. прымае ўдзел у арганізацыі міжнародных форумаў у Рэспубліцы Беларусь і за мяжой;

6.8. каардынуе і кантралюе працэс заключэння міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, дае заключэнні аб адпаведнасці праектаў міжнародных дагавораў і (або) пазіцыі Рэспублікі Беларусь на перамовах міжнародным абавязацельствам Рэспублікі Беларусь, прымае практычныя меры па забеспячэнню ўступлення ў сілу міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляе агульнае назіранне за выкананнем міжнародных дагавораў і аказвае садзейнічанне дзяржаўным органам Рэспублікі Беларусь у межах сваёй кампетэнцыі ў выкананні міжнародных дагавораў, а таксама ўлік міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь;

6.9. распрацоўвае ў межах сваёй кампетэнцыі праекты міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, праводзіць работу па іх заключэнні і выкананні;

6.10. удзельнічае ў рабоце міжведамасных органаў Рэспублікі Беларусь па рэгуляванні знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці;

6.11. ажыццяўляе дзейнасць па прыцягненні міжнароднай тэхнічнай дапамогі па прыярытэтных напрамках, якія вызначаюцца Нацыянальнай праграмай міжнароднага тэхнічнага супрацоўніцтва;

6.12. ажыццяўляе каардынацыю дзейнасці рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, юрыдычных асоб у частцы забеспячэння адзінай палітыкі Рэспублікі Беларусь па прадастаўленнізамежнымі дзяржавамі і іх адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі міжнароднай тэхнічнай дапамогі;

6.13. ажыццяўляе падрыхтоўку заключэння аб адпаведнасці праектаў (праграм) міжнароднай тэхнічнай дапамогі, падрыхтаваных замежнымі дзяржавамі або іх адміністрацыйна- тэрытарыяльнымі адзінкамі, нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь;

6.14. забяспечвае захаванне адзінага дзяржаўнага пратакола Рэспублікі Беларусь;

6.15. распрацоўвае ў межах сваёй кампетэнцыі прапановы па прывядзенні заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з яе

міжнароднымі абавязацельствамі, а таксама праекты прававых актаў па пытаннях знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці;

6.16. прымае ў межах кампетэнцыі МЗС нарматыўныя прававыя акты;

6.17. ажыццяўляе работу па афармленні членства Рэспублікі Беларусь у міжнародных арганізацыях;

6.18. каардынуе перамоўную пазіцыю і фарміруе пакет дакументаў па далучэнні Рэспублікі Беларусь да Сусветнай гандлёвай арганізацыі;

6.19. удзельнічае ў распрацоўцы і рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця ў частцы знешнеэканамічнай дзейнасці;

6.20. каардынуе распрацоўку і рэалізацыю нацыянальных праграм развіцця экспарту і праграм актывізацыі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з асноўнымі краінамі-партнёрамі;

6.21. аналізуе паказчыкі знешнегандлёвай дзейнасці Рэспублікі Беларусь, у тым ліку таварную і геаграфічную структуру знешняга гандлю;

6.22. прымае ўдзел у аналізе справаздачнага гандлёвага і плацежнага балансаў і распрацоўцы прагнозных паказчыкаў знешняга гандлю;

6.23. каардынуе работу па мытна-тарыфным рэгуляванні знешняга гандлю таварамі;

6.24. ажыццяўляе маніторынг мер нетарыфнага рэгулявання знешняга гандлю таварамі, а таксама мытнага заканадаўства ў частцы выканання Рэспублікай Беларусь і замежнымі дзяржавамі міжнародных абавязацельстваў у гэтай галіне і эфектыўнасці нетарыфнага рэгулявання для нарошчвання экспарту тавараў з Рэспублікі Беларусь;

6.25. уносіць ва Урад Рэспублікі Беларусь прапановы па прымяненні антыдэмпінгавых, кампенсацыйных і спецыяльных ахоўных мер у знешнім гандлі па выніках расследаванняў, якія праводзіць МЗС;

6.26. удзельнічае у расследаваннях, якія праводзяцца замежнымі дзяржавамі, па прымяненні антыдэмпінгавых, кампенсацыйных і спецыяльных ахоўных мер у адносінах да тавараў, якія выраблюцца юрыдычнымі і фізічнымі асобамі Рэспублікі Беларусь;

6.27. удзельнічае ў распрацоўцы прапаноў па павелічэнні экспартнага патэнцыялу краіны;

6.28. садзейнічае абароне эканамічных інтарэсаў дзяржавы, фізічных і юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь за мяжой;

6.29. садзейнічае ўсталяванню сувязяў і развіццю супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі і юрыдычнымі асобамі, якіяажыццяўляюць інвестыцыйную дзейнасць;

6.30. садзейнічае прыцягненню замежных інвестыцый у эканоміку краіны, фарміраванню спрыяльнага інвестыцыйнага іміджу Рэспублікі Беларусь за мяжой і павышэнню яе інвестыцыйнага рэйтынгу;

6.31. выключаны;

6.32. ажыццяўляе мерапрыемствы па развіцці адносін з замежнымі дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі, форумамі і рэжымамі ў галіне міжнароднай бяспекі, нераспаўсюджання, раззбраення і кантролю над узбраеннямі;

6.33. ажыццяўляе каардынацыю дзейнасці рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання па выпрацоўцы і захаванні адзінай палітыкі Рэспублікі Беларусь у галіне міжнародных рэжымаў экспартнага кантролю і нераспаўсюджання;

6.34. забяспечвае ў межах сваёй кампетэнцыі ўзгадненне ліцэнзій на ўвоз / вываз спецыфічных тавараў (работ, паслуг) і дазволаў на транзіт прадукцыі ваеннага прызначэння праз тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

6.35. ажыццяўляе падрыхтоўку прапаноў аб складзе і функцыях сумесных двухбаковых камісій па пытаннях гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, забяспечвае дзейнасць гэтых камісій;

6.36. аказвае садзейнічанне ў развіцці знешнеэканамічнай інфраструктуры Рэспублікі Беларусь, у тым ліку яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і суб'ектаў гаспадарання;

6.37. ажыццяўляе ўзаемадзеянне з Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь па пытаннях правядзення нацыянальных выставачна-кірмашовых мерапрыемстваў і стварэння тавараправоднай сеткі за мяжой, а таксама нетарыфнага рэгулявання знешняга гандлю таварамі ў межах кампетэнцыі МЗС;

6.38. ажыццяўляе арганізацыйнае і інфармацыйнае забеспячэнне працы Міжведамаснага савета па развіцці экспарту, Міжведамаснай камісіі па пытаннях далучэння Рэспублікі Беларусь да Сусветнай гандлёвай арганізацыі, арганізацыйна- тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці Міжведамаснага каардынацыйнага савета па ўдасканаленні сістэмы абароны інтарэсаў суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці Рэспублікі Беларусь пры ажыццяўленні імі знешнеэканамічнай дзейнасці;

6.39. ажыццяўляе падрыхтоўку абгрунтаванняў і праектаў рашэнняў аб устанаўленні дыпламатычных адносін Рэспублікі Беларусь з замежнымі дзяржавамі і членстве краіны ў міжнародных арганізацыях;

6.40. афармляе даверчыя і адзыўныя граматы кіраўнікам дыпламатычных прадстаўніцтваў Рэспублікі Беларусь, паўнамоцтвы на правядзенне перагавораў і падпісанне міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, удзел у рабоце міжнародных форумаў;

6.41. выдае патэнты кіраўнікам консульскіх устаноў Рэспублікі Беларусь, прымае патэнты і выдае экзекватуры кіраўнікам консульскіх устаноў замежных дзяржаў у Рэспубліцы Беларусь;

6.42. ведае ў межах сваёй кампетэнцыі пытаннямі грамадзянства;

6.43. забяспечвае афармленне ў межах сваёй кампетэнцыі пашпартна-візавай дакументацыі для выезду за мяжу і ўезду на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляе іншыя віды консульскай дзейнасці;

6.44. ажыццяўляе кантроль за наяўнасцю ў замежных грамадзян дагавора абавязковага медыцынскага страхавання пры афармленні віз для ўезду ў Рэспубліку Беларусь;

6.45. ва ўстаноўленым парадку ажыццяўляе падрыхтоўку заключэння аб мэтазгоднасці прадастаўлення іншаземцу прыстанішча ў Рэспубліцы Беларусь;

6.46. узгадняе прадстаўленні да ўзнагароджання дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пражываюць у іншых краінах;

6.47. ажыццяўляе неабходныя меры па акрэдытацыі кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў замежных дзяржаў у Рэспубліцы

Беларусь і прадстаўніцтваў міжнародных арганізацый і міждзяржаўных утварэнняў у Рэспубліцы Беларусь, вядзе ўлік і рэгістрацыю супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх установ замежных дзяржаў, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь, праводзіць з імі пратакольную працу, ажыццяўляе кантроль за выкананнем на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дыпламатычных і консульскіх прывілеяў і імунітэтаў;

6.48. ажыццяўляе выдачу дазволаў на адкрыццё прадстаўніцтваў юрыдычных асоб і іншых арганізацый, зарэгістраваных ва ўстаноўленым парадку ў замежнай дзяржаве, адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак замежных дзяржаў;

6.49. ажыццяўляе кантакты з дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі замежных дзяржаў, прадстаўніцтвамі міжнародных арганізацый у Рэспубліцы Беларусь і вядзе з імі дыпламатычную і консульскую перапіску;

6.50. ажыццяўляе агульную каардынацыю мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы інфармацыйнага забеспячэння знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці;

6.51. прадстаўляе матэрыялы для афіцыйных публікацый па пытаннях знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь, праводзіць прэс-канферэнцыі і брыфінгі для журналістаў сродкаў масавай інфармацыі;

6.52. ажыццяўляе інфармацыйнае забеспячэнне замежных устаноў;

6.53. ажыццяўляе акрэдытацыю журналістаў замежных сродкаў масавай інфармацыі, а таксама выконвае асобныя функцыі, звязаныя з адкрыццём, падаўжэннем тэрміну дзеяння пасведчанняў аб адкрыцці карэспандэнцкіх пунктаў замежных сродкаў масавай інфармацыі і спыненнем дзейнасці такіх пунктаў;

6.54. забяспечвае правядзенне ў сістэме органаў дыпламатычнай службы дзяржаўнай кадравай палітыкі, ажыццяўляе падбор, падрыхтоўку, перападрыхтоўку і расстаноўку кадраў;

6.55. уносіць ва ўстаноўленым парадку прапановы аб прызначэнні на дыпламатычныя пасады, уключаныя ў кадравы рэестр Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь;

6.56. разглядае ў межах сваёй кампетэнцыі ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку звароты (прапановы, заявы, скаргі) грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, і юрыдычных асоб (далей – звароты), вядзе прыём грамадзян па пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі МЗС;

6.56$^{1}$. па выніках разгляду зваротаў, аўтары якіх не задаволены вынікамі іх разгляду замежнымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь і дзяржаўнымі арганізацыямі, якія падпарадкаваны МЗС, пры наяўнасці падстаў для станоўчага вырашэння пытанняў, якія выказаны ў зваротах, выдае гэтым арганізацыям і ўстановам абавязковыя для выканання прадпісанні аб належным вырашэнні гэтых пытанняў;

6.56$^{2}$. ажыццяўляе праверкі выканання ў замежных установах Рэспублікі Беларусь і дзяржаўных арганізацыях, падпарадкаваных МЗС, парадку разгладу зваротаў, у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, арганізуе выязныя праверкі работы са зваротамі;

6.56$^{3}$. па кожнаму выпадку неналежнага разгляду замежнымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь і дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі МЗС, зваротаў накіроўвае іх кіраўнікам прадстаўлення аб прыцягненні службовых асоб, якія дапусцілі парушэнне парадку разгляду зваротаў, да дысцыплінарнай адказнасці;

6.57. праводзіць мерапрыемствы па сацыяльнаму забеспячэнню, паляпшэнню ўмоў працы, жыллёвых, культурна-бытавых умоў і медыцынскага абслугоўвання работнікаў МЗС;

6.58. ажыццяўляе кіраўніцтва дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі МЗС, зацвярджае іх статуты, прымае рашэнні аб стварэнні, рэарганізацыі і спыненні дзейнасці такіх арганізацый;

6.59. ажыццяўляе ведамасны кантроль за дзейнасцю замежных устаноў Рэспублікі Беларусь і дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных МЗС;

6.60. рэалізуе ў адпаведнасці з заканадаўствам права на валоданне, карыстанне і распараджэнне маёмасцю, якая знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці;

6.61. ажыццяўляе каардынацыю дзейнасці Беларускай гандлёва-прамысловай палаты па выкананьні перададзеных ёй у адпаведнасці з заканадаўствам функцый у рамках кампетэнцыі МЗС;

6.62. ўносіць у савет Беларускай гандлёва-прамысловай палаты прапановы па прызначэнні і вызваленні ад пасады яе старшыні;

6.62[1]. ажыццяўляе ва ўстаноўленым парадку закупкі тавараў (работ, паслуг) за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту ў межах каштарысу на чарговы фінансавы (бюджэтны) год;

6.63. ажыццяўляе іншыя функцыі, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

7. МЗС у межах сваёй кампетэнцыі мае права:

7.1. запытваць у рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых арганізацый інфармацыю па пытаннях, якіяўваходзяць у яго кампетэнцыю, у парадку, устаноўленым заканадаўствам;

7.2. заслухоўваць прадстаўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, а таксама кіраўнікоў дзяржаўных арганізацый па пытаннях, якія адносяцца да кампетэнцыі МЗС, даваць у межах сваёй кампетэнцыі абавязковыя для выканання ўказанні па ліквідацыі дапушчаных недахопаў і ў выпадку невыканання гэтых указанняў ставіць пытанне аб персанальнай адказнасці адпаведных кіраўнікоў;

7.3. прыцягваць ва ўстаноўленым парадку для кансультацый, вывучэння і вырашэння праблем у сферы знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці зацікаўленыя рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, арганізацыі, навуковыя ўстановы, асобных, у тым ліку замежных, навукоўцаў і спецыялістаў, а таксама міжнародныя і замежныя навукова-даследчыя, кансалтынгавыя, эканамічныя, фінансавыя, аўдытарскія і іншыя ўстановы;

7.4. праводзіць з удзелам зацікаўленых нарады па пытаннях знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь;

7.5. прымаць ва ўстаноўленым парадку ў межах сваёй кампетэнцыі нарматыўныя прававыя акты, арганізоўваць і правяраць іх выкананне;

7.6. прымаць у неабходных выпадках сумесна з іншымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання нарматыўныя прававыя акты;

7.7. заслухоўваць кіраўнікоў замежных установ Рэспублікі Беларусь па пытаннях ажыццяўлення знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь;

7.8. засноўваць друкаваныя выданні;

7.9. засноўваць ўзнагароды МЗС;

7.10. ствараць, рэарганізоўваць і ліквідаваць ва ўстаноўленым парадку дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя МЗС;

7.11. ажыццяўляць іншыя паўнамоцтвы, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

8. У структуру МЗС ўваходзяць дэпартамент з правамі юрыдычнай асобы (далей - дэпартамент), галоўныя ўпраўленні, упраўленні, аддзелы, сектары.

9. МЗС ўзначальвае Міністр, які назначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Міністр па пасадзе з'яўляецца членам Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, мае намеснікаў, якія прызначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады ва ўстаноўленым парадку.

10. Міністр:

10.1. ажыццяўляе кіраўніцтва сістэмай МЗС на аснове адзінаначалля;

10.2. нясе персанальную адказнасць за выкананне ўскладзеных на МЗС і замежныя ўстановы Рэспублікі Беларусь задач і функцый;

10.3.кіруе працай па рэалізацыі адзінай знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, уключаючы яе знешнеэканамічны складнік;

10.4. прадстаўляе МЗС ва ўзаемаадносінах з дзяржаўнымі органамі Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнымі органамі замежных дзяржаў, а таксама з міжнароднымі арганізацыямі;

10.5. у межах сваёй кампетэнцыі выдае загады і падпісвае пастановы МЗС;

10.6. размяркоўвае абавязкі паміж намеснікамі Міністра, вызначае паўнамоцтвы кіраўнікоў структурных падраздзяленняў МЗС і кіраўнікоў падпарадкаваных МЗС дзяржаўных арганізацый, каардынуе іх дзейнасць, устанаўлівае ступень адказнасці названых службовых асоб;

10.7. уносіць ва ўстаноўленым парадку на разгляд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь праекты прававых актаў і міжнародных дакументаў па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю МЗС;

10.8. зацвярджае структуру і штатны расклад цэнтральнага апарата МЗС і замежных устаноў Рэспублікі Беларусь у межах устаноўленых фонду аплаты працы і колькасці работнікаў, статуты падпарадкаваных МЗС дзяржаўных арганізацый;

10.9. вырашае ва ўстаноўленым парадку пытанні прыёму на працу і звальнення з працы работнікаў цэнтральнага апарата МЗС і замежных устаноў Рэспублікі Беларусь, заключае кантракты з кіраўнікамі падпарадкаваных МЗС арганізацый і ажыццяўляе кантроль за выкананнем іх умоў;

10.10. назначае на пасады па ўзгадненні з Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь (у адпаведнасці з кадравым рэестрам Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь) і Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь начальнікаў структурных падраздзяленняў (акрамя дырэктара дэпартамента), паслоў па асобых даручэннях, а таксама дыпламатычных работнікаў замежных устаноў Рэспублікі Беларусь (дарадніка і вышэй) ва ўстаноўленым парадку;

10.11. уносіць ва ўстаноўленым парадку прапановы аб прызначэнні на пасады паслоў і пастаянных прадстаўнікоў пры міжнародных арганізацыях, дараднікаў-пасланцаў, пасланцаў, паверанных у справах і генеральных консулаў, прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь у органах міждзяржаўных утварэнняў;

10.11[1]. адклікае ва ўстаноўленым парадку дыпламатычных работнікаў і работнікаў адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу замежных устаноў Рэспублікі Беларусь;

10.12. уносіць ва ўстаноўленым парадку прапановы аб прызначэнні на пасаду намеснікаў Міністра, дырэктара дэпартамента, у адпаведнасці з заканадаўствам заключае з імі кантракты;

10.13. зацвярджае палажэнні аб структурных падраздзяленнях цэнтральнага апарату МЗС (акрамя дэпартамента);

10.14. змацоўвае сваёй подпісам даверчыя граматы і паўнамоцтвы, а таксама граматы аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь і аб далучэнні да іх;

10.15. мае права ў межах агульнай каштарысу валютных сродкаў, якіявыдзяляюцца на ўтрыманне замежных установ Рэспублікі Беларусь, у выпадку неабходнасці самастойна ўносіць змены ў каштарыс іх расходаў;

10.16. забяспечвае абарону дзяржаўных сакрэтаў у цэнтральным апараце МЗС;

10.17. прымяняе меры заахвочвання работнікаў МЗС і кіраўнікоў дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных МЗС, і накладае дысцыплінарныя спагнанні на іх;

10.17[1]. сцвярджае графікі праверак выканання ў падпарадкаваных дзяржаўных арганізацыях парадку разгляду зваротаў;

10.18. ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

11. Для калектыўнага абмеркавання найбольш важных пытанняў і выпрацоўкі рашэнняў па іх у МЗС ўтвараецца калегія ў складзе Міністра (старшыня калегіі), намеснікаў Міністра, дырэктара Дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці па пасадзе. У яе склад па рашэнню Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь могуць ўваходзіць іншыя работнікі МЗС, замежных установ Рэспублікі Беларусь і іншых арганізацый, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні МЗС. Колькасць калегіі зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Рашэнні калегіі афармляюцца пратаколамі і рэалізуюцца, як правіла, пастановамі МЗС і загадамі Міністра. У выпадку рознагалоссяў паміж Міністрам і членамі калегіі рашэнне прымае Міністр, дакладваючы аб ім у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Члены калегіі маюць права інфармаваць Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь аб сваёй пазіцыі.

12. Цэнтральны апарат МЗС і замежныя ўстановы Рэспублікі Беларусь фінансуюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

13. МЗС з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае бягучы (разліковы) рахунак і іншыя рахункі ў банках, пячатку і бланкі з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і сваім найменнем.

**ПАЛАЖЭННЕ аб Дэпартаменце знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь**

1. Дэпартамент знешнеэканамічнай дзейнасці Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь з правамі юрыдычнай асобы (Далей - Дэпартамент) з'яўляецца структурным падраздзяленнем цэнтральнага апарату Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь (далей - МЗС), якому нададзены дзяржаўна-ўладныяпаўнамоцтвы і якое ажыццяўляе спецыяльныя (выканаўчыя, кантрольныя, функцыі рэгулявання і іншыя) функцыі МЗС у сферы знешнеэканамічнай дзейнасці.

Дэпартамент выконвае свае функцыі ва ўзаемадзеянні з іншымі структурнымі падраздзяленнямі цэнтральнага апарата МЗС, дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі і консульскімі ўстановамі Рэспублікі Беларусь (далей - замежныя ўстановы Рэспублікі Беларусь), а таксама дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі МЗС.

2. Дэпартамент ў сваёй дзейнасці кіруецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і гэтым Палажэннем.

3. Дэпартамент мае пячатку і бланкі з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь са сваім найменнем і найменнем МЗС, а таксама іншыя пячаткі і штампы.

4. Задачамі Дэпартамента з'яўляюцца:

4.1. садзейнічанне развіццю экспарту тавараў і паслуг;

4.2. распрацоўка прапаноў у сферы знешнеэканамічнай дзейнасці;

4.3. каардынацыя фарміравання знешнегандлёвага рэжыму Рэспублікі Беларусь у сферы знешняга гандлю таварамі;

4.4. абарона знешнеэканамічных інтарэсаў дзяржавы;

4.5. удзел у распрацоўцы і рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у частцы знешнеэканамічнай дзейнасці;

4.6. каардынацыя перамоўнай пазіцыі і фарміраванне пакета дакументаў па далучэнні Рэспублікі Беларусь да Сусветнай гандлёвай арганізацыі;

4.7. каардынацыя распрацоўкі і рэалізацыі нацыянальных праграм развіцця экспарту;

4.8. ажыццяўленне аналізу паказчыкаў знешнегандлёвай дзейнасці Рэспублікі Беларусь, у тым ліку таварнай і геаграфічнай структуры знешняга гандлю;

4.9. удзел у аналізе справаздачнага гандлёвага і аплатнага балансаў і распрацоўцы прагнозных паказчыкаў знешняга гандлю;

4.10. каардынацыя работы па мытна-тарыфным рэгуляванні знешняга гандлю таварамі;

4.11. ажыццяўленне маніторынгу мер нетарыфнага рэгулявання знешняга гандлю таварамі, а таксама мытнага заканадаўства ў частцы выканання Рэспублікай Беларусь і замежнымі дзяржавамі міжнародных абавязацельстваў у гэтай галіне і эфектыўнасці нетарыфнага рэгулявання для нарошчвання экспарту тавараў з Рэспублікі Беларусь;

4.12. падрыхтоўка для ўнясення ва Урад Рэспублікі Беларусь прапаноў па прымяненні антыдэмпінгавых, кампенсацыйных і спецыяльных ахоўных мер у знешнім гандлі па выніках расследаванняў,якія праводзіць МЗС;

4.13. ўдзел у расследаваннях, якія праводзяць замежныя дзяржавы, па прымяненні антыдэмпінгавых, кампенсацыйных і спецыяльных ахоўных мер у адносінах да тавараў, якія вырабляюцца юрыдычнымі і фізічнымі асобамі Рэспублікі Беларусь;

4.14. удзел у распрацоўцы прапаноў па павелічэнні экспартнага патэнцыялу краіны;

4.15. садзейнічанне абароне эканамічных інтарэсаў дзяржавы, фізічных і юрыдычных асоб Рэспублікі Беларусь за мяжой;

4.16. садзейнічанне прыцягненню замежных інвестыцый у эканоміку краіны, фарміраванні спрыяльнага інвестыцыйнага іміджу Рэспублікі Беларусь за мяжой і павышэнню яе інвестыцыйнага рэйтынгу.

5. Дэпартамент у адпаведнасці з ускладзенымі на яго задачамі ажыццяўляе наступныя функцыі:

5.1. забяспечвае каардынуючую ролю МЗС па:

5.1.1. распрацоўцы нацыянальных праграм развіцця экспарту і мерапрыемстваў па іх рэалізацыі;

5.1.2. распрацоўцы і ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у галіновыя, тэрытарыяльныя, краінавыя і рэгіянальныя стратэгіі развіцця экспарту;

5.1.3. фарміраванні штогадовых заданняў па аб'ёмах экспарту і прыцягненню замежных інвестыцый, пастаўках у вартасным выражэнні па асноўнай наменклатуры экспартных тавараў у разрэзе краін знаходжання замежных устаноў Рэспублікі Беларусь;

5.1.4. распрацоўцы прапаноў і мерапрыемстваў па стымуляванні і нарошчванні экспарту і аптымізацыі імпарту;

5.1.5. пытаннях дзейнасці інфармацыйнага рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства «Нацыянальны цэнтр маркетынгу і кан'юнктуры цэн »у межах кампетэнцыі Дэпартамента;

5.1.6. пытаннях дзейнасці Беларускай гандлёва-прамысловай палаты па выкананні перададзеных ёй у адпаведнасці з заканадаўствам функцый у межах кампетэнцыі Дэпартамента;

5.1.7. мытна-тарыфным рэгуляванні знешняга гандлю таварамі;

5.1.8. падрыхтоўцы перамоўнай пазіцыі і фарміраванні пакета дакументаў па далучэнні Рэспублікі Беларусь да Сусветнай гандлёвай арганізацыі;

5.2. забяспечвае ўдзел МЗС ў:

5.2.1. распрацоўцы прапаноў па ўдасканаленні палітыкі ў галіне знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь і рэалізацыі рашэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у гэтай сферы;

5.2.2. падрыхтоўцы прапаноў па забеспячэнні эканамічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь у межах кампетэнцыі Дэпартамента;

5.2.3. працы створаных у Рэспубліцы Беларусь міжведамасных органаў у галіне знешнеэканамічнай дзейнасці;

5.2.4. складанні прагнозаў знешнегандлёвага балансу;

5.2.5. падрыхтоўцы прапаноў па павышэнню прывабнасці Рэспублікі Беларусь як транзітнай краіны і фарміраванні спрыяльнага інвестыцыйнага іміджу;

5.2.6. падрыхтоўцы прапаноў па правядзенні нацыянальных выставачна-кірмашовых мерапрыемстваў за мяжой;

5.2.7. інфармацыйным забеспячэнні знешнеэканамічнай дзейнасці;

5.2.8. падрыхтоўцы праектаў міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь у галіне рэгулявання знешнеэканамічнай дзейнасці;

5.2.9. ажыццяўленні маніторынгу мер нетарыфнага рэгулявання знешняга гандлю таварамі на іх адпаведнасць міжнародным абавязацельствам Рэспублікі Беларусь і выканання адпаведных абавязацельстваў замежнымі дзяржавамі;

5.2.10. арганізацыі і правядзенні ў Рэспубліцы Беларусь і за мяжой міжнародных форумаў, канферэнцый і семінараў па знешнеэканамічнай дзейнасці;

5.2.11. распрацоўцы прапаноў па пазіцыі Рэспублікі Беларусь на шматбаковых і двухбаковых перамовах па далучэнні да Сусветнай гандлёвай арганізацыі;

5.2.12. падрыхтоўцы і накіраванні ў Сусветную гандлёвую арганізацыю дакументаў па знешнегандлёвым рэжыме Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі гэтай арганізацыі;

5.3. ажыццяўляе:

5.3.1. аналіз паказчыкаў знешнегандлёвай дзейнасці Рэспублікі Беларусь, у тым ліку таварнай і геаграфічнай структуры знешняга гандлю;

5.3.2. маніторынг выканання мерапрыемстваў па рэалізацыі нацыянальных праграм развіцця экспарту;

5.3.3. падрыхтоўку праектаў нарматыўных прававых актаў у галіне знешнеэканамічнай дзейнасці па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Дэпартамента;

5.3.4. падрыхтоўку прапаноў па прымяненні мер дзяржаўнага рэгулявання знешнегандлёвай дзейнасці па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Дэпартамента;

5.3.5. распрацоўку прапаноў па ўдасканаленні мер мытна-тарыфнага рэгулявання з удзелам зацікаўленых;

5.3.6. падрыхтоўку прапаноў па ўдзелу Рэспублікі Беларусь у зонах свабоднага гандлю, мытных саюзах, іншых міждзяржаўных утварэннях;

5.3.7. вывучэнне міжнародных рэжымаў гандлю таварамі і паслугамі;

5.3.8. падрыхтоўку прапаноў па забеспячэнні прынцыпу ўзаемнасці пры прымяненні да замежных дзяржаў (груп дзяржаў) мер дзяржаўнага рэгулявання знешнегандлёвай дзейнасці;

5.3.9. абарону інтарэсаў суб'ектаў гаспадарання Рэспублікі Беларусь пры правядзенні замежнымі дзяржавамі расследаванняў па прымяненні антыдэмпінгавых, кампенсацыйных і спецыяльных ахоўных мер у адносінах да тавараў, якія паходзяць з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

5.3.10. правядзенне расследаванняў, якія папярэднічаюць прыняццю спецыяльных ахоўных, антыдэмпінгавых і кампенсацыйных мер у адпаведнасці з заканадаўствам;

5.3.11. ўнясенне ва Урад Рэспублікі Беларусь прапаноў па прымяненні антыдэмпінгавых, кампенсацыйных, спецыяльных ахоўных і адказных мер у знешнім гандлі па выніках расследаванняў;

5.3.12. арганізацыйнае і інфармацыйнае забеспячэнне працы Міжведамаснага савета па развіцці экспарту;

5.3.13. выпрацоўку перагаворных пазіцый, арганізацыю і правядзенне міжнародных перамоў і кансультацый па пытаннях доступу на таварныя рынкі;

5.3.14. функцыі рабочага сакратарыята Міжведамаснай камісіі па пытаннях далучэння Рэспублікі Беларусь да Сусветнай гандлёвай арганізацыі;

5.3.15. распаўсюджванне за мяжой праз замежныя ўстановы Рэспублікі Беларусь інфармацыі аб інвестыцыйных праектах, прапанаваных да рэалізацыі ў Рэспубліцы Беларусь;

5.3.16. прадстаўленне інфармацыі аб умовах ажыццяўлення знешнеэканамічнай дзейнасці ў замежных дзяржавах;

5.3.17. выдачу дазволаў на адкрыццё ў Рэспубліцы Беларусь прадстаўніцтваў замежных арганізацый, аналіз і кантроль іх дзейнасці, распрацоўку адпаведных прапаноў і рэкамендацый;

5.3.18. выключаны;

5.4. аказвае садзейнічанне:

5.4.1. развіццю знешнеэканамічнай інфраструктуры Рэспублікі Беларусь;

5.4.2. прыцягненню замежных інвестыцый у эканоміку Рэспублікі Беларусь;

5.4.3. прасоўванні знешнеэканамічных інтарэсаў удзельнікаў знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь за мяжой;

5.4.4. дасягненню дадатнага сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі.

6. Дэпартамент мае правa:

6.1. выключаны;

6.2. уносіць на разгляд МЗС прапановы па пытаннях, аднесеных да кампетэнцыі Дэпартамента, у тым ліку праекты нарматыўных прававых актаў;

6.3. запытваць у рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых арганізацый інфармацыю па пытаннях, ўваходзяць у яго кампетэнцыю, у парадку, устаноўленым заканадаўствам;

6.4. запрашаць прадстаўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама для ўдзелу ў міжнародных перамовах па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Дэпартамента;

6.5. праводзіць міжнародныя перамовы па пытаннях, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Дэпартамента;

6.6. ажыццяўляць іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з заканадаўствам.

7. Дэпартамент ўзначальвае дырэктар, які назначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар Дэпартамента падпарадкоўваецца Міністру замежных спраў Рэспублікі Беларусь і яго намесніку, які курыруе дзейнасць Дэпартамента.

Дырэктар Дэпартамента мае намеснікаў, колькасць якіх вызначаецца Міністрам замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Намеснікі дырэктара Дэпартамента прызначаюцца на пасаду і вызваляюцца ад пасады Міністрам замежных спраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненні з Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар Дэпартамента з'яўляецца членам калегіі МЗС па пасадзе.

8. Дырэктар Дэпартамента:

8.1. кіруе дзейнасцю Дэпартамента і нясе персанальную адказнасць за рэалізацыю Дэпартаментам дзяржаўна-ўладных паўнамоцтваў у сферы знешнеэканамічнай дзейнасці і выкананне ўскладзеных на Дэпартамент задач і функцый;

8.2. выдае ў межах сваёй кампетэнцыі загады і распараджэнні;

8.3. зацвярджае палажэнні аб структурных падраздзяленнях Дэпартамента;

8.4. размяркоўвае абавязкі паміж намеснікамі;

8.5. ўносіць Міністру замежных спраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб прызначэнні на пасаду, вызваленні ад пасады работнікаў Дэпартамента, прымяненні да іх мер заахвочвання або накладання дысцыплінарных спагнанняў;

8.6. зацвярджае па ўзгадненню з Міністрам замежных спраў Рэспублікі Беларусь структуру Дэпартамента ў межах установленых колькасці работнікаў МЗС і выдаткаў на яго ўтрыманне;

8.7. прадстаўляе інтарэсы Дэпартамента ў дзяржаўных органах і іншых арганізацыях;

8.8. без даверанасці дзейнічае ад імя Дэпартамента;

8.9. прымае меры па падтрыманні і захаванні выканальніцкай і працоўнай дысцыпліны, ажыццяўляе мерапрыемствы па паляпшэнні ўмоў працы, адпачынку і быту работнікаў Дэпартамента;

8.10. ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў адпаведнасці з ускладзенымі на Дэпартамент задачамі і функцыямі.

9. Фінансаванне дзейнасці Дэпартамента ажыццяўляецца на падставе каштарысу, які зацвярджаецца Міністрам замежных спраў Рэспублікі Беларусь, у межах расходаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на фінансаванне МЗС.

Матэрыяльна-тэхнічнае, фінансавае і кадравае забеспячэнне дзейнасці Дэпартамента ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным для цэнтральнага апарата МЗС.

10. Месца знаходжання Дэпартамента: 220030, г. Мінск, вул. Леніна, 19.